# ЭКСКУРСІЯ ПА МЕСЦАХ БАЯВОЙ СЛАВЫ
# **«Герояў не забудзем імёны»**

**Аўтар:** намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Булдыска А.А.

Прапанаваная форма правядзення экскурсіі – папулярызацыя падзей Вялікай Айчыннай вайны з наведваннем месцаў баявой славы на тэрыторыі аг.Старыца.

Мэта:

фарміраванне грамадзянскіх і патрыятычных якасцей экскурсантаў, развіццё сацыяльна сталай асобы, засваенне экскурсантамі агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей, ідэалогіі беларускай дзяржавы, культурных і духоўных традыцый беларускага народа

Задачы:

1. Фарміраванне ў экскурсантаў сістэмы ведаў аб сваёй Радзіме, якая можа быць прадстаўлена наступным чынам: прыродазнаўчыя і геаграфічныя звесткі (геагарафічныя асаблівасці роднага краю, клімату, прыроды, краіны), звесткі аб жыцці свайго народа (асаблівасці быту, працы, культуры, традыцый), сацыяльныя звесткі (веды аб роднай вёсцы, краіне ў гады Вялікай Айчыннай вайны), некаторыя гістарычныя звесткі (аб жыцці народа ў розныя перыяды, аб подзвігах людзей у гады Вялікай Айчыйнай вайны, веды аб гістарычных помніках аграгарадка).
2. Выхаванне ў экскурсанту інтарэса да навакальнага свету, эмацыянальнай імпатыі на падзеі грамадскага жыцця. Прадугледжвае актывізацыю эмацыянальнай сферы асобы, выхаванне такіх пачуццяў, як любоў да родных і блізкіх людзей, роднай вёскі, павага да гісторыі народа.

**Працягласць –** 1 гадзіна 20 хвілін.

**Тэхналагічная карта маршрута экскурсіі**
**па месцах баявой славы**
**«Герояў не забудзем імёны»**

*Аг.Старыца (паварот на в.Бадзяжы) – аг.Старыца вул.Партызанская – аг.Старыца вул.Школьная*

**Працягласць – 1 гадзіна 20 хвілін**

Знаёмства экскурсавода і экскурсантаў, азнаямленне з мэтай экскурсіі.

Правядзенне інструктажу па тэхніцы бяспекі ў час паездкі на транспарце - 5 хвілін.

| Маршрут Працягласць, спосаб перамяшчэння | Прыпынкі | Аб’екты паказу | Час (хв.) | Назвы падтэм і пералік асноўных пытанняў, якія раскрываюць тэму |
|---|---|---|---|---|
| Аг.Старыца (на асабовым транспарце) | Паварот на в.Бадзяжы | Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан | 20 | 1. Кароткія звесткі пра будаўніцтва помніка.<br>2. Гераічныя старонкі барацьбы ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі вёскі.<br>3. Звесткі аб геаграфічнай асаблівасці в.Старыца. |
| Аг.Старыца, вул.Партызанская | Выезд з вёскі па вул.Партызанская | Помнік у гонар партызан | 20 | 1. Гераічныя старонкі партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі вёскі.<br>2. Звесткі аб геаграфічнай асаблівасці лясоў вакол в.Старыца |
| Аг.Старыца, вул.Школьная | Вул.Школьная, 5 | Будынак школы, мемарыяльны комплекс | 40 | 1. Мемарыяльныя дошкі на будынку школы:<br>- у гонар падпольнага міжрайкама КП (Б)Б Слуцкай зоны;<br>- у гонар партызанскага атрада імя Чапаева;<br>2. Мемарыяльны комплекс у гонар загінуўшых землякоў. |

**Нитка маршрута**

**г.Минск – аг.Старыца (паварот на в.Бадзяжы) –**
**аг.Старыца вул.Партызанская – аг.Старыца**
**вул.Школьная – г.Минск**




Р61
Р61
Магазин
Старица
ул. Дунаева
Р91
Р91
Р61
Р91
Р91
1941-1945
Чтобы
раздел
Google